# Лажэчнікаў у Віцебску

Іван Іванавіч Лажэчнікаў, рускі пісьменнік, аўтар вядомага гістарычнага рамана «Ледяной дом», нарадзіўся ... верасня 179? г. ў гор. Каломне, у багатай купецкай сям'і. Сваё дзяцінства аўтар апісвае ў творах «Немного лет тому назад» і «Беленькие, серенькие и чёрненькие». У час айчыннай вайны 1812 г. Лажэчнікаў таемна ад бацькоў пайшоў у армію і ўдзельнічаў у бітвах пад Таруцінам, Малаяраслаўцам і Барысавам, а таксама пры ўваходзе рускіх войск у Парыж.

У 1817 г. у часопісе «Вестник Европы» былі надрукаваны яго «Походные записки русского офицера», якія звярнулі на сябе ўвагу і зрабілі маладога пісьменніка папулярным.

Мы ведаем І. І. Лажэчнікава як аўтара гістарычных

раманаў: «Последний Новик» (1831—1833), «Ледяной дом» (1835) і «Басурман» (1838), якія ў свой час былі вельмі папулярнымі. Бялінскі лічыў Лажэчнікава «першым рускім раманістам».

З 1820 г. Лажэчнікаў працаваў дырэктарам вучылішч у Міністэрстве народнай асветы. З 1842 г. ён служыў віцэ-губернатарам у Тверы.

У 1853 г. Лажэчнікаў назначаецца віцэ-губернатарам у гор. Віцебск, дзе жыве (каменны дом насупроць Нікалаеўскага сабора) да чэрвеня 1854 г.

У архіве Віцебскага губернскага праўлення захаваліся 2 справы аб службе І. І. Лажэчнікава. У 1910 г. яны былі перададзены Вучонай Архіўнай камісіі: 1) Фармулярны спіс аб службе Віцебскага віцэ-губернатара статскага саветніка Лажэчнікава; 2) Атэстат, выданы І. І. Лажэчнікаву Віцебскім губернскім праўленнем; 3) Прашэнне І. І. Лажэчнікава на імя віцебскага губернатара з просьбаю захаваць за ім пенсію пасля адстаўкі; 4) Адказ Упраўлення генерал-губернатара на прашэнне І. І. Лажэчнікава.

Дакументы гэтыя апублікаваны В. Арсеньевым у «Трудах Витебской Архивной Комиссии» (1910 г. кн. І) і захоўваюцца ў аддзеле беларускай літаратуры і бібліяграфіі Дзяржаўнай Бібліятэкі БССР імя Леніна.

Пасля выезду свайго з Віцебска, Лажэчнікаў часта ўспамінаў Беларусь і ў публіцыстычных творах не раз зварочваў увагу грамадскасці на цяжкое становішча беларускіх сялян 50—60-х гадоў XIX стагоддзя.

**Н. ВАТАЦЫ.**